Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГІСТОРЫЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па абавязковым модулі для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*

2018

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйнага стандарту «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін», зацверджанага Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.07.2014, і тыпавой вучэбнай праграмы па абавязковым модулі «Гісторыя», зацверджанай 30.06.2014, рэгістрацыйны № ТД-СГ.023/тып.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. Я. Паўлава,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*Л. У. Ландзіна,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*П. І. Бондар,* прафесар кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар гістарычных наук, прафесар;
*А. М. Бяляўскі,* дацэнт кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 22.03.2017);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 20.04.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Я. Паўлава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па абавязковым модулі «Гісторыя» («Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў рамках цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Яна скіравана на авалоданне студэнтамі асноўнымі тэарэтычнымі дасягненнямі гістарычнай навукі, апрацоўку, асэнсаванне і сістэматызацыю вучэбнай інфармацыі, набыццё практыка-арыентаваных уменняў. Вызначальнымі асаблівасцямі дадзенай праграмы ў параўнанні з папярэднімі з'яўляюцца: удасканаленне зместу абавязковага модуля, выкарыстанне прафесійнага, кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні, значнае павелічэнне ролі і ўдзельнай вагі самастойнай работы студэнтаў, магчымасць выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій.

Месца вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» у сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў вызначаецца тым, што прадметам яе вывучэння з'яўляюцца найбольш важныя пытанні дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця беларускага народа ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык.

Актуальнасць вывучэння гісторыі Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі абумоўлена неабходнасцю выпрацоўкі аб'ектыўнага навуковага погляду на гісторыю беларускага народа, які сфарміраваўся ў працэсе ўзаемадзеяння разнастайных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў. Гэта з'яўляецца абавязковай умовай, якая забяспечвае падрыхтоўку не толькі спецыяліста-прафесіянала, але і фарміраванне ў асобы якасцей грамадзяніна і патрыёта.

Асноўнымі мэтамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў, як вызначана ў адукацыйным стандарце «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін», выступаюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Агульныя патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта вызначаюцца наступнымі прынцыпамі:

– гуманізацыі як прыярытэтнага прынцыпу адукацыі, што забяспечвае асобасна арыентаваны характар адукацыйнага працэсу і творчую самарэалізацыю студэнта;

– фундаменталізацыі, што садзейнічае арыентацыі зместу дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла на выяўленне сутнасных асноў і сувязей паміж разнастайнымі працэсамі навакольнага свету, прыродазнаўчымі і гуманітарнымі ведамі;

– кампетэнтнаснага падыходу, што вызначае сістэму патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэсу, накіраваных на павышэнне ролі самастойнай працы студэнтаў, мадэлюючага сацыяльна-прафесійныя праблемы і шляхі іх вырашэння, што забяспечвае фарміраванне ў студэнтаў здольнасці дзейнічаць у зменлівых жыццёвых абставінах;

– сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі, што забяспечвае фарміраванне ў студэнтаў сацыяльна-асобаснай кампетэнтнасці, заснаванай на адзінстве набытых гуманітарных ведаў і ўменняў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін і сацыяльна-творчага вопыту з улікам інтарэсаў, патрэб і магчымасцей студэнтаў;

– міждысцыплінарнасці і інтэгратыўнасці сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, рэалізацыя якога забяспечвае цэласнасць вывучэння гуманітарных ведаў і яго ўзаемасувязь з сацыяльным кантэкстам будучай прафесійнай дзейнасці студэнта.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый адпаведна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі (САК):**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі (крытычнае мысленне).

САК-5. Умець працаваць у камандзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Акадэмічныя кампетэнцыі (АК):**

АК-1. Валодаць і ўжываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным інтэграваць новыя ідэі (крэатыўнасць).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Асноўнымі мэтамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі з'яўляюцца фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асобасных задач і функцый.

Задача вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» заключаецца ў набыцці студэнтамі практычных навыкаў аналізу гістарычных фактаў і падзей, што забяспечвае фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта, заснаваных на сістэме каштоўнасцей, якая сфарміравалася ў працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа і эвалюцыі яго дзяржаўнасці, што з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічнай асновай, неабходнай для якаснай сацыяльна-прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

У адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту студэнт павінен *ведаць:*

– асаблівасці фармацыйнага і цывілізацыйнага падыходаў да вывучэння і разумення гісторыі Беларусі ў кантэксце ўсходнеславянскай і заходнееўрапейскай цывілізацый;

– змястоўныя характарыстыкі працэсу этнічнага і нацыянальнага фарміравання беларускага народа на розных гістарычных этапах;

– сутнасныя характарыстыкі гістарычных форм дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі і станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў XX – пачатку XXI ст.;

– характэрныя рысы і вынікі рэалізацыі гістарычных мадэлей мадэрнізацыі беларускага грамадства, у тым ліку савецкай;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, значэнне і месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце;

– дасягненні беларускага народа ў развіцці духоўнай і матэрыяльнай культуры;

*умець:*

– выкарыстоўваць фармацыйны і цывілізацыйны падыходы пры характарыстыцы асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага народа;

– характарызаваць умовы і вынікі этнічнага і нацыянальнага фарміравання беларускага народа ў розныя гістарычныя перыяды;

– аналізаваць працэс паслядоўнай змены гістарычных форм дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі, афармлення і замацавання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

– ажыццяўляць параўнальны аналіз рэформ і рэвалюцый у працэсе мадэрнізацыі беларускага грамадства, ацэньваць вынікі дзейнасці савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР;

– характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у асобныя гістарычныя перыяды, уклад беларускага народа ў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне; аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах еўрапейскай інтэграцыі і сусветнай глабалізацыі;

– тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на гістарычнае развіццё беларускага народа і выкарыстоўваць гісторыка-культурную спадчыну Беларусі ў сваёй дзейнасці.

Для рэалізацыі вышэйазначаных мэт неабходна вырашэнне наступных задач:

– фарміраванне ў студэнтаў ведаў, уменняў, вопыту аналізу заканамернасцей і асаблівасцей дзяржаўна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага, духоўнага развіцця беларускага народа, якія ўвасоблены ў калектыўнай гістарычнай памяці і служаць асновай для нацыянальнай самасвядомасці пры ўспрыманні гісторыі як свайго мінулага;

– засваенне студэнтамі сістэмы духоўных, культурных, матэрыяльных каштоўнасцей беларускага народа, і развіццё на гэтай аснове здольнасці да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнай сітуацыі з асэнсаваннем сваёй ідэнтычнасці і перспектыў будучага развіцця;

– гатоўнасць выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь у аб’ёме сваіх кампетэнцый, сфарміраваных у выніку ўсвядомленага засваення і выкарыстання вучэбнай гістарычнай інфармацыі, садзейнічаць дальнейшаму развіццю сваёй краіны.

Структураванне зместу вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» ажыццяўляецца пры дапамозе вылучэння ў ім узбуйненых дыдактычных адзінак (раздзелаў, тэм).

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)» для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі адводзіцца 72 гадзіны, з якіх 34 – аўдыторныя гадзіны. Размеркаванне па відах заняткаў: лекцыі – 18 гадзін, семінарскія заняткі – 16 гадзін. Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі адводзіцца 14 аўдыторных гадзін. Размеркаванне па відах заняткаў: лекцыі – 10 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – дыферэнцыраваны залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Метадалагічныя асновы і крыніцазнаўчая база айчыннай гісторыі. Суадносіны перыядызацыі сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі Беларусі. Прадмет, задачы, структура і змест курса. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі.

Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, яе асноўныя кірункі. Дыскусійныя пытанні гісторыі Беларусі.

## Раздзел I. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях

*Тэма 1. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу*

Найстаражытнае насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель у перыяд каменнага веку. Неалітычная рэвалюцыя. Індаеўрапейцы. Этнічныя працэсы на беларускіх землях. Балты. Рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. Узаемаадносіны славян з аўтахтонным насельніцтвам.

Эканамічныя і палітычныя фактары фарміравання беларускага этнасу ў XIV–XVIII стст. Усходнеславянскі этнічны падмурак Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ). Роля хрысціянскай царквы ў кансалідацыі беларускага этнасу. Паходжанне назвы «Белая Русь». Этнічная самасвядомасць беларусаў. Духоўнае жыццё беларускіх зямель у IX–XVIII стст.

Развіццё беларускага этнасу ва ўмовах мадэрнізацыі ў другой палове XIX ст. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў. Тэорыя «заходнерусізму». Ідэі беларускага нацыянальнага адраджэння ў XIX – пачатку XX ст.

*Тэма 2. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст.*

Цывілізацыйныя працэсы еўрапейскага Сярэдневякоўя і развіццё ўсходнеславянскіх зямель. Станаўленне ранніх дзяржаўных утварэнняў усходніх славян на беларускіх землях. Полацкае і Тураўскае княствы, іх узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дам. Полацкая дынастыя. Княжацка-вечавы лад. Берасцейская зямля і Пасожжа. Аграрнае развіццё грамадства. Рамесная вытворчасць і гандаль. Узнікненне гарадоў і іх роля ў грамадскім жыцці.

Духоўнае жыццё і культура на беларускіх землях. Прыняцце хрысціянства. Распаўсюджванне пісьменства. Летапісанне. Рукапісныя кнігі, жывапіс і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Царкоўнае і абарончае дойлідства. Полацкая і гродзенская школы дойлідства. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы.

Палітычная сітуацыя на беларускіх землях у канцы XII – пачатку XIII ст. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага. Міндоўг. Войшалк, Трайдзень. Цэнтралізатарская палітыка Віценя, Гедыміна. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у другой палове XIV – першай палове XVI ст. Пагроза з боку крыжакоў і ардынцаў. Крэўская унія. Ягайла і Вітаўт. Праўленне Казіміра Ягайлавіча. Саперніцтва з Маскоўскай дзяржавай. Асаблівасці дзяржаўнага ладу ВКЛ. Органы ўлады і кіравання. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Статуты Вялікага Княства Літоўскага. Юрыдычнае замацаванне правоў шляхты.

Сацыяльная структура грамадства. Структура феадальнага землеўладання. Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку Вялікага Княства Літоўскага. Аграрная рэформа 1557 г. Станаўленне фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Сацыяльна-палітычнае развіццё гарадоў і мястэчак. Магдэбургскае права і сістэма гарадскога самакіравання на беларускіх землях. Рамяство і гандаль. Развіццё цэхаў. Зараджэнне мануфактурнай вытворчасці.

Лівонская вайна. Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай і спецыфіка яе дзяржаўных інстытутаў. Асаблівасці развіцця ВКЛ у складзе РП. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай. Войны XVII–XVIII стст. і іх наступствы для беларускіх зямель. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII–XVIII стст. Узмацненне феадальнай анархіі. Вытокі крызісу Рэчы Паспалітай. Падзелы Рэчы Паспалітай.

Канфесійныя адносіны на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVII стст. Рэфармацыя і Контррэфармацыя ў Беларусі. Брэсцкая царкоўная унія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё культуры Беларусі ў эпоху Адраджэння і Асветніцтва. Стан школьнай адукацыі, літаратуры. Рэнесансна-гуманістычныя ідэі асветнікаў і мысліцеляў Беларусі. Творчасць М. Гусоўскага. Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, М. Сматрыцкі. Развіццё мастацтва. Тэатры на беларускіх землях. Месца беларускай культуры ў еўрапейскім культурна-цывілізацыйным працэсе.

*Тэма 3. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.)*

Перамены ў эканамічным, палітычным і сацыяльным стане беларускіх зямель пасля ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Асноўныя напрамкі эканамічнай, сацыяльнай, канфесійнай палітыкі царскага ўрада ў Беларусі. Мяжа яўрэйскай аседласці. «Разбор шляхты». Палітыка царызму ў сістэме адукацыі. Віленскі ўніверсітэт.

Беларусь у вайне 1812 г. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам-восенню 1812 г. Адносіны да вайны розных катэгорый насельніцтва. Палітыка французскіх акупацыйных улад. Заканчэнне вайны і яе вынікі для Беларусі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у першай палове XIX ст. Узнікненне мануфактур і першых фабрык. Месца эканомікі Беларусі ва ўсерасійскім рынку. Рэалізацыя ў Беларусі рэформы П. Д. Кісялёва. Стварэнне тайных таварыстваў. Зараджэнне беларускага нацыянальна-культурнага руху. Паўстанне 1830–1831 гг. і яго наступствы.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Падрыхтоўка рэформы і Маніфест 19 лютага 1861 г. Асаблівасці правядзення аграрнай рэформы ў заходняй і ўсходняй частках Беларусі. Сутнасць буржуазных рэформ 60–70-х гг. XIX ст.: судовая, цэнзурная, школьная, гарадская, ваенная, земская. Асаблівасці іх рэалізацыі ў Беларусі. Контррэформы. Сталыпінская аграрная рэформа. Асаблівасці прамысловага перавароту ў Беларусі. Галіновая структура прамысловасці. Урбанізацыя. Фарміраванне буржуазіі і рабочага класа, асаблівасці іх нацыянальнага складу. Развіццё транспартнай сістэмы, сродкаў сувязі, гарадской інфраструктуры. Гандаль. Развіццё банкаўскай сістэмы.

Грамадска-палітычны рух у другой палове XIX – пачатку XX ст. Беларускае нацыянальнае адраджэнне. Паўстанне 1863–

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1864 гг. Дзейнасць К. Каліноўскага. Народніцкія гурткі. Зараджэнне сацыял-дэмакратычнага руху. Стварэнне «Гуртка беларускай народнай асветы» і «Беларускай сацыялістычнай грамады» (БСГ). Праграма БСГ. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва».

Прычыны і ход рэвалюцыі 1905–1907 гг. Царскі Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г. «Курлоўскі растрэл» у Мінску. Выбары ў Дзяржаўную думу. Дэпутаты ад Беларусі і іх пазіцыя. Земская рэформа ў беларускіх губернях.

Прычыны і пачатак Першай сусветнай вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бежанства. Нямецкая акупацыя заходніх раёнаў.

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. і фарміраванне органаў новай улады. Расстаноўка палітычных сіл у Беларусі і на Заходнім фронце вясной-восенню 1917 г.

## Раздзел II. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў ХХ – пачатку ХХІ ст.

### *Тэма 4. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 г.)*

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі. Першыя пераўтварэнні. І Усебеларускі з’езд (снежань 1917 г.). Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Дзейнасць Рады БНР ва ўмовах нямецкай акупацыі. Дзейнасць нацыянальнага камісарыята і Цэнтральнага бюро беларускіх секцый РКП (б) у 1918 г. А. Чарвякоў. Д. Жылуновіч. Пазіцыя Аблвыканкамзаха па пытанні стварэння савецкай рэспублікі ў Беларусі. Маніфест Часовага ўрада ССРБ (БССР) ад 1 студзеня 1919 г. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел).

Геапалітычнае становішча Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст.: вынікі Першай сусветнай вайны; беларускае пытанне пры афармленні Версальска-Вашынгтонскай сістэмы. Пачатак польскай інтэрвенцыі ў лютым-сакавіку 1919 г. Стабілізацыя фронту ў верасні 1919 г. Стварэнне Беларускага паўстанцкага камітэта. Контрнаступленне Чырвонай арміі ў ліпені 1920 г., вызваленне тэрыторыі ССРБ. Вынікі савецка-польскай вайны. Рыжская мірная дамова 1921 г. у гістарычным лёсе беларускага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эканамічнае і сацыяльна-палітычнае становішча ў Беларусі ў 1920-я гг. Узбуйненне БССР. План ГОЭЛРО. Увядзенне нэпа. Пачатак індустрыялізацыі. Кааперацыя ў сельскай мясцовасці. «Прышчэпаўшчына». Грашовая рэформа. Вынікі і супярэчнасці нэпа. Прычыны згортвання нэпа.

Роля і месца БССР у складзе СССР. Усталяванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР. Дзейнасць грамадскіх і нацыянальных арганізацый. Пераход да аднапартыйнасці. Зацвярджэнне сталінскай мадэлі будаўніцтва сацыялізму. Прыняцце першых пяцігадовых планаў. Сутнасць, асаблівасці і сродкі правядзення індустрыялізацыі. Сацыяльная палітыка ў БССР. Усталяванне дырэктыўных і рэпрэсіўных метадаў кіравання эканомікай. Перадумовы калектывізацыі. Хлебанарыхтоўчы крызіс і пераход да фарсіраванай калектывізацыі. «Вялікі пералом» 1929 г. Метады правядзення калектывізацыі.

Мерапрыемствы ў галіне адукацыі. Барацьба з непісьменнасцю. Моўная палітыка ў БССР. Беларусізацыя. Беларуская навука ў 1920–1930-я гг. Развіццё літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі, архітэктуры, беларускага тэатра і кіно. Культурная палітыка ў вёсцы і горадзе. Уплыў таталітарнай сістэмы на культурнае жыццё. Стаўленне савецкай улады да царквы.

Усталяванне таталітарнай сістэмы і культу асобы І. В. Сталіна. Справа «Саюза вызвалення Беларусі». Хваля рэпрэсій 1929–1938 гг. Рэпрэсіі ў галіне літаратуры (А. Бабарэка, М. Гарэцкі, І. Дубоўка, Я. Дыла, М. Лужанін і інш.). Прыняцце Канстытуцыі СССР 1936 г., механізм правядзення выбараў і фарміравання дзяржаўнага апарату ў СССР і БССР.

Грамадска-палітычнае, эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы. Палітыка польскіх улад па нацыянальнай і дзяржаўнай асіміляцыі насельніцтва Заходняй Беларусі. Стан асветы і культуры ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць Беларускага пасольскага клуба і Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ). Утварэнне КПЗБ. Камсамол Заходняй Беларусі. Таварыства беларускай школы (ТБШ). Клуб «Змаганне». Сялянскі рух. Выступленні нарачанскіх і браслаўскіх рыбакоў. Рэпрэсіўныя мерапрыемствы польскіх улад. Уплыў на вызваленчы рух у Заходняй Беларусі палітыкі Камінтэрна і палітычных рэпрэсій у БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 5. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны*

Абвастрэнне супярэчнасцей паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў канцы 1930-х гг. Мюнхенская змова. Правал палітыкі калектыўнай бяспекі. Пакт Молатава-Рыбентропа. Пачатак Другой сусветнай вайны. Увядзенне савецкіх войск на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Мерапрыемствы савецкай улады на заходнебеларускіх тэрыторыях.

Мабілізацыя эканомікі і ідэалагічная работа савецкай улады перад Вялікай Айчыннай вайной. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. План «Барбароса». Суадносіны сіл СССР і Германіі. Пагранічныя баі. Абарона Брэсцкай крэпасці. Наступленне нямецкіх войск, захоп Мінска. Адступленне савецкіх войск. Прычыны паражэнняў Чырвонай арміі ў пачатковы перыяд вайны.

Устанаўленне акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. План «Ост». Адміністрацыйнае кіраванне акупіраванымі тэрыторыямі. Палітыка генацыду. Стварэнне лагераў смерці і гета. Вываз насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію.

Калабарацыя і яе прычыны. Стварэнне маладзёжных прафашысцкіх арганізацый. Акупацыйная палітыка ў галіне адукацыі.

Арганізацыя партызанскага і падпольнага руху на акупіраванай тэрыторыі. Мэты, формы і змест дзейнасці партызан і падпольшчыкаў. Стварэнне партызанскіх зон і партызанскіх краёў. Рэйкавая вайна, яе этапы і вынікі. Карныя экспедыцыі акупантаў.

Бітва пад Масквой, Сталінградская і Курская бітвы. Карэнны пералом у вайне. Пачатак вызвалення Беларусі восенню 1943 г. Аднаўленчыя мерапрыемствы на вызваленых тэрыторыях. Аперацыя «Баграціён»: мэты, ход, сродкі выканання. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх войск. Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, яе крыніцы і значэнне. Удзел беларускіх прадстаўнікоў у заснаванні і дзейнасці ААН.

## *Тэма 6. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.)*

Становішча БССР пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грамадска-палітычнае становішча ў краіне. Узмацненне культу асобы І. В. Сталіна. Барацьба за ўладу пасля смерці І. В. Сталіна. Дзейнасць К. Т. Мазурава на чале кіраўніцтва БССР. Дасягненні шостай пяцігодкі і сямігодкі. Укараненне дасягненняў НТР, асваенне космасу, стварэнне новых галін прамысловасці. Мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы.

Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё падчас «адлігі». XX з'езд КПСС і яго вынікі. Рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій часоў сталінізму. Стварэнне саўнаргасаў. Адстаўка М. С. Хрушчова. Прыход да ўлады Л. І. Брэжнева. П. М. Машэраў на чале кіраўніцтва БССР. Эканамічная рэформа 1965 г. і яе вынікі. Спецыялізацыя прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу СССР.

Вычарпанне магчымасцей экстэнсіўнай мадэлі. Сутнасць паняцця «застой». Крыніцы адноснай стабільнасці савецкай эканомікі. Узмацненне адміністрацыйных метадаў кіравання і цэнтралізацыі эканомікі. Складанасці ў сельскай гаспадарцы, яе нізкая рэнтабельнасць. Спробы рэфармавання аграрнай галіны. Стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Прыняцце харчовай праграмы.

Грамадска-палітычнае жыццё ў 60–80-я гг. XX ст. Змены ў сацыяльнай структуры і адукацыйным узроўні насельніцтва. Ідэалагічныя прыярытэты ў культуры, адукацыі, навуцы. Дзяржаўная рэлігійная палітыка і становішча канфесій. Манаполія КПСС і КПБ на інфармацыю. Дысідэнцтва ў СССР і БССР.

Развіццё адукацыі і культуры. Павелічэнне колькасці вышэйшых навучальных устаноў. Рэфармаванне сярэдняй школы. Асноўная тэматыка твораў літаратуры і мастацтва ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі і на працягу 1970–1980-х гг. Архітэктура, скульптура, музыка, тэатр, кіно.

Міжнародная дзейнасць БССР у ААН і іншых міжнародных арганізацыях.

Нарастанне крызісных з'яў у эканамічным і палітычным жыцці СССР у другой палове 80-х гг. XX ст. Прычыны і кірункі палітыкі перабудовы. Красавіцкі (1985) Пленум ЦК КПСС і яго рашэнні. Фарміраванне шматпартыйнасці і палітычнай апазіцыі, рост грамадскай актыўнасці. З'яўленне і дзейнасць нефармальных культурна-асветніцкіх арганізацый. Чарнобыльская аварыя, яе наступствы, уплыў на сацыяльна-палітычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стан грамадства. Няздольнасць КПБ прапанаваць грамадству альтэрнатыўныя шляхі развіцця. Пачатак распаду СССР. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

*Тэма 7. Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст.*

Жнівеньскія падзеі 1991 г. у СССР. «Парад суверэнітэтаў». Наданне канстытуцыйнага статусу Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Спыненне дзейнасці КПБ. Белавежскія пагадненні. Распад СССР і ўтварэнне СНД. Карэнныя змены геапалітычнага становішча і міжнародных адносін.

Сістэмны крызіс грамадства ў першай палове 1990-х гг. Стварэнне перадумоў пераходу да рынкавай эканомікі. Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Сусветны эканамічны і фінансавы крызіс на рубяжы XX–XXI стст. і яго ўплыў на краіны Усходняй Еўропы. Сучасны стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы Беларусі.

Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Выбары Прэзідэнта і фарміраванне новай сістэмы ўлады. Рэспубліканскія рэферэндумы 1995 і 1996 гг., іх вынікі. Эвалюцыя «вертыкалі» ўлады і кіравання. Станаўленне шматпартыйнасці, асноўныя палітычныя партыі і іх праграмы.

Міжнароднае становішча і дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць урада Беларусі ў галіне скарачэння ўзбраенняў. Шматвектарнасць знешняй палітыкі. Эканамічнае, навукова-тэхнічнае, культурнае і гуманітарнае супрацоўніцтва Беларусі з краінамі свету. Удзел Беларусі ў міжнародных навуковых, культурных, спартыўных і іншых мерапрыемствах. Беларуска-расійскія адносіны, стварэнне Саюза Беларусі і Расіі, фарміраванне мытнага саюза і адзінай эканамічнай прасторы. Беларусь і СНД.

Адукацыя, навука і культура Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная сістэма адукацыі. Стан гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя кірункі развіцця літаратуры і мастацтва. Узаемаадносіны дзяржавы і царквы, адраджэнне рэлігійна-канфесійнага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ
(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | |
| Уводзіны | 2 | | |
| **Раздзел І. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** | | | |
| Тэма 1. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу | 2 | 2 | падрыхтоўка прэзентацыі |
| Тэма 2. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст. | 4 | 2 | дыскусія |
| Тэма 3. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.) | 2 | 4 | міні-даклад |
| **Раздзел ІІ. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў ХХ – пачатку ХХІ ст.** | | | |
| Тэма 4. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917– чэрвень 1941 г.) | 2 | 2 | адказ на пытанні |
| Тэма 5. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны | 2 | 2 | адказ на пытанні |
| Тэма 6. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.) | 2 | 2 | дыскусія |
| Тэма 7. Рэспубліка Беларусь у канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. | 2 | 2 | рэферат |
| **Разам…** | **18** | **16** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ ДЛЯ ФЗН
(завочная форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | |
| Уводзіны | 2 | | |
| **Раздзел І. Фарміраванне беларускага этнасу і дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях** | | | |
| Тэма 1. Гістарычныя этапы фарміравання беларускага этнасу | 2 | | падрыхтоўка прэзентацыі |
| Тэма 2. Дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях у IX–XVIII стст. | 2 | 2 | дыскусія |
| Тэма 3. Становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай дзяржавы (канец XVIII ст. – кастрычнік 1917 г.) | | 2 | міні-даклад |
| **Раздзел ІІ. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці і ўмацаванне яе суверэнітэту ў XX – пачатку XXI ст.** | | | |
| Тэма 4. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў Беларусі (кастрычнік 1917 – чэрвень 1941 г.) | 2 | | адказ на пытанні |
| Тэма 5. Беларусь у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны | | 2 | адказ на пытанні |
| Тэма 6. БССР: дасягненні і праблемы стваральнай працы народа ў пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.) | | 2 | дыскусія |
| Тэма 7. Рэспубліка Беларусь у канцы XX – пачатку XXI ст. | 2 | | рэферат |
| **Разам…** | **10** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Бригадин, П. И.* История Беларуси в контексте европейской цивилизации: курс лекций / П. И. Бригадин. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. – 336.

2. *Бяспалая, М. А.* Гісторыя Беларусі: ад старажытнасці да канца XVIII ст. : вучэб.-метад. комплекс / М. А. Бяспалая ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 322 с.

3. *Галубовіч, В. І.* Эканамічная гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. / В. І. Галубовіч [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 1999. – 454 с.

4. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэб. дапам. / пад рэд. В. І. Галубовіча, Ю. М. Бохана [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – 334 с.

5. Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002.

6. Гісторыя Беларусі : курс лекцый: у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998 – 2012 (тое ж на рускай мове).

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. М. Бохан [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006.

8. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. – Минск : Беларусь, 2003. – 274 с.

9. *Ермаловіч, М. І.* Старажытная Беларусь / М. І. Ермаловіч. – Мінск : Мастац. літ., 1990. – 296 с.

10. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб. пособие для студентов учреждений высш. образования / С. А. Елизаров [и др.]. – 2-е изд., испр. – Минск : Высш. шк., 2016. – 398, [1] с.

11. *Коваленя, А. А.* Беларусь 1939–1945. Война и политика / А. А. Коваленя. – Минск : Веды, 2001. – 204 с.

12. *Ковкель, И. И.* История Беларуси с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. – Минск : Аверсэв, 2006. – 604 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13.* Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995.

*14. Сагановіч, Г. М.* Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя / Г. М. Сагановіч. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.

*Дадатковая*

*1. Анішчанка, Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1771–1996) / Я. К. Анішчанка ; пад рэд. У. А. Сосна. – Мінск : Веды, 1998. – 220 с.

*2. Арлоў, У. А.* Таямніцы полацкай гісторыі / У. А. Арлоў. – Мінск : Беларусь, 1994. – 463 с.

*3.* Беларусізацыя: 1920-я гады : дакументы і матэрыялы / пад рэд. Р. П. Платонава, У. І. Коршука. – Мінск : БДУ, 2001. – 284 с.

*4.* Беларусь, 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2010.

*5.* Белоруссия в эпоху капитализма : сб. документов и материалов : в 4 т. – Минск : Наука и техника, 1959–1979.

*6.* Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов : в 4 т. – Минск : Наука и техника, 1959–1979.

*7. Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии / Т. Б. Блинова. – Минск : Беларусь, 1990. – 190 с.

*8. Бяспалая, М. А.* Эканамічнае і сацыякультурнае развіццё беларускай вёскі ў гады нэпа (1921–1927) / М. А. Бяспалая. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 345 с.

*9. Вайтовіч, Н. Г.* Баркулабаўскі летапіс / Н. Г. Вайтовіч. – Мінск : Беларусь, 1977. – 205 с.

*10.* Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны : документы и материалы : в 3 т. – Минск : Беларусь, 1967–1982.

*11. Грицкевич, А. П.* Западный фронт РСФСР, 1918–1920. Борьба между Россией и Польшей за Белоруссию / науч. ред. А. Е. Тараса. – Минск : Харвест, 2010. – 496 с.

*12. Грыцкевіч, А.* Старонкі нашай мінуўшчыны / А. Грыцкевіч. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 468 с.

*13.* Индустриализация Белорусской ССР (1926–1941 гг.) : сб. документов и материалов / сост.: В. Н. Жигалов [и др.]. – Минск : Беларусь, 1975. – 467 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Калиновский, К.* Из печатного и рукописного наследия / К. Калиновский. – Минск : Беларусь, 1988. – 208 с.

15. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Беларусь, 2006. – 92 с.

16. *Ладысеў, У. Ф.* На пераломе эпох. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920) / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 1999. – 128 с.

17. *Літвін, А. М.* Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі / А. М. Літвін. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2000. – 288 с.

18. *Мальдзіс, А.* На скрыжаванні славянскіх традыцый / А. Мальдзіс. – Мінск : Беларусь, 1980. – 352 с.

19. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944) / пад рэд. У. М. Міхнюка. – Мінск : БелНДЦДААС, 1995. – 416 с.

20. Освобожденная Беларусь : документы и материалы : в 2 кн. / Комитет по архивам и делопроизводству. – Минск : НАРБ, 2004–2005.

21. Публицистика белорусских народников: нелегальные издания белорусских народников (1881–1884) : сб. документов. – Минск : Беларусь, 1983. – 213 с.

22. *Самусік, А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі : вучэб. дапам. / А. Ф. Самусік. – Мінск : БДЭУ, 2001. – 209 с.

23. *Трусаў, А. А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск : Лекцыя, 2001. – 203 с.

24. *Туронак, Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2006. – 877 с.

25. Уния в документах : сб. / сост.: В. А. Теплова, З. И. Зуева. – Минск : Лучи Софии, 1997. – 518 с.

26. Хрестоматия по истории БССР. 1917–1983 / сост.: А. П. Игнатенко [и др.]. – Минск : Университетское, 1984. – 453 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца (або выбіраюцца і адаптуюцца) у адпаведнасці з мэтамі і задачамі абавязковага модуля, навукова-метадычнымі перавагамі і прафесійным вопытам выкладчыка.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы студэнтаў з'яўляюцца: выкананне тэставых заданняў, рашэнне праблемных сітуацый і задач, а таксама выкананне творчых заданняў (аналіз навуковых артыкулаў, складанне на іх анатацый, рэцэнзій, рэфератаў, напісанне эсэ, распрацоўка праектаў і інш.).

Вялікая ўдзельная вага гадзін, якія адводзяцца на самастойную працу студэнтаў па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, прадугледжвае модульную форму арганізацыі навучальнага працэсу. Пры выбары кафедрай і выкладчыкамі тэхналогій праблемна-модульнага навучання з улікам сучаснага міжнароднага і айчыннага вопыту мэтазгодна ажыццяўляць структураванне зместу вучэбнай дысцыпліны па наступных модулях:

нулявы модуль, які служыць увядзеннем у вывучэнне вучэбнай дысцыпліны, вызначае мэты і задачы яе засваення;

модулі навучальныя – гэта модулі тэарэтычнага зместу вучэбнай дысцыпліны, колькасць і назвы якіх суадносяцца з асноўнай праблемай і вядучай ідэяй (канцэпцыяй) вучэбнай дысцыпліны;

модуль рэзюмэ, які змяшчае абагульненне вывучанай вучэбнай дысцыпліны, вызначае сістэму прадметных і міжпрадметных паняццяў і сувязей;

модуль кантролю, які забяспечвае выніковы кантроль засваення ведаў і ўменняў (спосабаў дзейнасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя метады (тэхналогіі) навучання

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання, якія адпавядаюць задачам вывучэння дадзенага абавязковага модуля, з’яўляюцца:

1) метады праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова пошукавы і даследчы метады);

2) асобасна арыентаваныя (развіваючыя) тэхналогіі, заснаваныя на актыўных (рэфлексійна-дзейнасных) формах і метадах навучання (мазгавы штурм, дзелавая, ролевая і імітацыйная гульні, дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты, круглы стол, кейс-тэхналогія, праект і інш.);

3) інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, якія забяспечваюць праблемна-даследчы характар працэсу навучання і актывізацыю самастойнай працы студэнтаў (структураваныя электронныя прэзентацыі для лекцыйных заняткаў, выкарыстанне аўдыя-, відэападтрымкі вучэбных заняткаў (аналіз аўдыя-, відэасітуацый і інш.), распрацоўка і прымяненне на аснове камп’ютарных і мультымедыйных сродкаў гістарычных творчых заданняў, дапаўненне традыцыйных навучальных заняткаў сродкамі ўзаемадзеяння на аснове сеткавых камунікацыйных магчымасцей (інтэрнэт-форум, інтэрнэт-семінар і інш.).

Па кожным раздзеле і тэме дадзенай вучэбнай праграмы ў адпаведнасці з іх мэтамі і задачамі выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных інавацыйных адукацыйных сродкаў і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у вучэбна-выхаваўчым працэсе, варта вылучыць: вучэбна-метадычныя комплексы (у тым ліку электронныя), варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, метад кейсаў, методыкі актыўнага навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні для самастойнага вывучэння
## па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі
## (у кантэксце еўрапейскай цывілізацыі)»
## для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі

1. Дайце характарыстыку старажытнага насельніцтва на тэрыторыі беларускіх зямель.

2. Пералічыце фактары, якія паўплывалі на фарміраванне беларускага этнасу.

3. Назавіце асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў і назвы «Белая Русь».

4. Што вы ведаеце пра існуючыя канцэпцыі паходжання Кіеўскай Русі?

5. Ахарактарызуйце асаблівасці ўлады ў Кіеўскай Русі.

6. Апішыце этапы трансфармацыі ідэнтычнасці і саманазвы беларускага этнасу.

7. Растлумачце тэрмін «заходнерусізм».

8. Вызначце асноўныя ідэі нацыянальнага адраджэння пачатку XX ст.

9. Ахарактарызуйце першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.

10. Вызначце асноўныя этапы развіцця Полацкага княства.

11. Вызначце прычыны і фактары, што паўплывалі на фарміраванне ВКЛ.

12. Якую ролю адыгралі ўсходнеславянскія землі ў працэсе ўтварэння ВКЛ.

13. Раскажыце пра структуру ўлады ў ВКЛ.

14. Пералічыце асноўныя рысы і асаблівасці феадалізму на беларускіх землях.

15. Вызначце этапы фарміравання феадальнага землеўладання на тэрыторыі ВКЛ.

16. Што вы ведаеце пра становішча сялян у XIII–XVI стст. і этапы іх запрыгоньвання?

17. Вызначце асаблівасці з’яўлення і развіцця гарадоў на беларускіх землях.

18. Дайце характарыстыку рэлігійнай сітуацыі на тэрыторыі ВКЛ у XIII–XVI стст.

19. Як паўплывалі Рэфармацыя і Контррэфармацыя на рэлігійную сітуацыю?

20. Вызначце асноўныя кірункі знешняй палітыкі ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

21. Якія князі ўнеслі найбольшы ўклад у пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ?

22. Калі адбылася Грунвальдская бітва і якое яна мела значэнне для гістарычнага развіцця Беларусі?

23. Якім чынам праявілася ўздзеянне Адраджэння на культуру ВКЛ?

24. Раскажыце пра ўдзел ВКЛ у Лівонскай вайне і яе вынікі.

25. Назавіце асаблівасці палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай.

26. Вызначце асноўныя кірункі эканамічнага развіцця беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай.

27. Прасачыце кірункі знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай.

28. Вылучыце асноўныя напрамкі рэфармавання Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

29. Назавіце прычыны падзелаў Рэчы Паспалітай.

30. Ахарактарызуйце ўплыў Асветніцтва на айчынную навуку і культуру.

31. Раскрыйце сутнасць тэрміна «прамысловая рэвалюцыя» і вызначце асаблівасці яе правядзення ў Беларусі.

32. Вызначце асноўныя напрамкі палітыкі царскага ўрада пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі.

33. Раскажыце пра асаблівасці нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

34. Растлумачце прычыны, сутнасць і вынікі рэформ 1860–1870-х гг.

35. Ахарактарызуйце развіццё беларускай культуры і навукі ў XIX ст.

36. Ахарактарызуйце асаблівасці правядзення буржуазных рэформ у Беларусі ў другой палове XIX ст.

37. Раскажыце пра паўстанне 1863 г.

38. Растлумачце асаблівасці контррэформ часоў кіравання Аляксандра II.

39. Ахарактарызуйце эвалюцыю беларускага нацыянальнага руху ў другой палове XIX ст.

40. Раскажыце пра асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.

41. Вызначце асаблівасці развіцця гаспадаркі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

42. Раскажыце пра этапы і падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

43. Параўнайце падзеі і вынікі Першай сусветнай вайны для беларускага народа і іншых народаў Еўропы.

44. Раскажыце пра асаблівасці ўсталявання савецкай улады на беларускай тэрыторыі.

45. Параўнайце правы жыхароў Беларусі, дэкляраваныя стваральнікамі БНР, БССР, ЛітБел.

46. Вызначце этапы польска-савецкай вайны і вынікі гэтага супрацьстаяння.

47. Дайце ацэнку ролі Польшчы і краін – удзельніц Версальскай канферэнцыі ў вызначэнні лёсу беларускага народа.

48. У чым сутнасць і асаблівасці нэпа ў Беларусі?

49. Якое значэнне для эканамічнага і палітычнага развіцця Беларусі мела ўзбуйненне рэспублікі ў 1924 і 1926 гг.?

50. На ваш погляд, з пункту гледжання эканомікі, ці была гэтак неабходна індустрыялізацыя і калектывізацыя гаспадаркі БССР?

51. Раскажыце пра становішча насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

52. Дайце характарыстыку нацыянальна-вызваленчаму руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

53. Вызначце асноўныя прычыны Другой сусветнай вайны.

54. Чаму не атрымалася стварыць адзіны антыфашысцкі блок у Еўропе?

55. Растлумачце сутнасць і прычыны падпісання савецка-германскіх дагавораў 1939–1940 гг.

56. Назавіце асноўныя падзеі ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР.

57. Дайце характарыстыку сітуацыі ў БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

58. Вызначце этапы і асноўныя падзеі перыяду абарональных баёў супраць войск Вермахта летам 1941 г. на тэрыторыі БССР.

59. Назавіце прычыны трагедыі савецкіх войск у Беларусі летам 1941 г.

60. Дайце агульную характарыстыку нацысцкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі.

61. Што ўяўляла сабой беларуская калабарацыя?

62. Назавіце асноўныя формы і герояў барацьбы насельніцтва Беларусі супраць акупантаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

63. Адзначце асноўныя этапы вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

64. Ахарактарызуйце этапы аднаўлення і змены ў народнай гаспадарцы БССР у другой палове 1940-х гг.

65. У чым праявіліся спробы рэфармавання эканомікі ў 1950–1960-я гг.?

66. Вызначце асноўныя галіны эканомікі БССР у 1960–1980-я гг.

67. Прааналізуйце асноўныя прычыны складвання механізма тармажэння сацыяльна-эканамічнага развіцця СССР і БССР у гады застою.

68. Якія палітычныя і адміністрацыйныя рэформы былі праведзены ў 1950–1960-я гг.?

69. Раскажыце пра дасягненні ў развіцці навукі, адукацыі і культуры БССР у 1945–1985 гг.

70. Раскажыце пра палітычны крызіс у СССР, асаблівасці яго праяўлення ў Беларусі.

71. Ахарактарызуйце сутнасць курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця і палітыку перабудовы.

72. У чым праявілася рэфармаванне палітычнага ладу ў СССР і БССР?

73. Як праходзіла станаўленне галоснасці ў БССР?

74. Якія змены адбыліся ў духоўным жыцці беларусаў у 1985–1990-х гг.?

75. Раскажыце пра Чарнобыльскую катастрофу і яе наступствы для Беларусі.

76. Вызначце асноўныя этапы афармлення незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

77. Ахарактарызуйце курс Рэспублікі Беларусь на сацыяльна арыентаваную рыначную эканоміку: дасягненні і перспектывы.

78. Вызначце асноўныя кірункі рэфармавання агульнай і вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

79. Пералічыце этапы стварэння Саюзнай дзяржавы: дасягненні і перспектывы.

80. Раскажыце пра развіццё культуры Рэспублікі Беларусь: дасягненні і цяжкасці (90-я гг. XX ст. – пач. XXI ст.).

81. Растлумачце шматвектарны характар знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.

82. Вызначце асноўныя кірункі грамадска-палітычнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ГІСТОРЫЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па абавязковым модулі для ўсіх спецыяльнасцей універсітэта*


Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,57. Ул.-выд. арк. 1,09. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ